Голас Радзімы

№ 6 (1370) ЛЮТЫ 1975 г. ВЫДАННЕ БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ ГОД ВЫДАННЯ 20-ТЫ ЦАНА 2 КАП.

Оплачено по расчету
МИНСК ГСП
ул Красноармейская 9

Барысаўская фабрыка піяніна — адна з буйнейшых у краіне. Зразумела, такой яна стала не адразу. Так, за ўвесь 1935 год было зроблена толькі 7 піяніна, а цяпер іх выпускаецца каля дзесятка кожную гадзіну. Прыгожыя, пявучыя, яны здольны гаварыць на мове, якую разумеюць без перакладчыка ва ўсім свеце. Таму барысаўскія піяніна «Беларусь» ідуць ва ўсе куткі краіны і на экспарт. У мінулым годзе калектыў фабрыкі выпусціў 18 тысяч інструментаў.

НА ЗДЫМКУ: Марыя ЖАЎТОК займаецца мантажом клавішнага механізма.

Фота М. АМЕЛЬЧАНКІ.

ЯК СТАЦЬ АКАДЭМІКАМ

Рэспубліканскі друк паведаміў нядаўна, што на агульным сходзе Акадэміі навук Беларусі выбраны новыя акадэмікі і члены-карэспандэнты АН БССР. Акадэмікамі сталі Б. Бойка, А. Дзмітрыеў, І. Ігнаценка і П. Яшчарыцын, членамі-карэспандэнтамі — М. Бадзяка, Б. Бокуць, А. Іваноў, Ю. Казлоў, І. Ліштван, Г. Сідарэнка, В. Ткачоў, І. Цітовіч, І. Цішчанка, В. Чачын і Д. Шыраканаў. У сувязі з гэтым карэспандэнт «Голасу Радзімы» У. БЯГУН звярнуўся з пытаннямі да намесніка галоўнага вучонага сакратара прэзідыума Акадэміі навук БССР Анатоля ЗЕЛЯНКЕВІЧА.

— Перш за ўсё варта было б растлумачыць нашым чытачам, каго менавіта выбіраюць акадэмікамі і членамі-карэспандэнтамі.

— Выдатных вучоных. Акадэмікамі — тых, хто ўзбагаціў навуку працамі вялікага навуковага значэння, членамі-карэспандэнтамі — хто ўзбагаціў яе буйнымі навуковымі працамі. Так сказана ў 12-м параграфе статута акадэміі.

— Калі ласка, назавіце такіх вучоных і іх дасягненні.

— Пачнём з акадэмікаў. Барыс Бойка, напрыклад, з'яўляецца загадчыкам лабараторыі аптычнай электронікі Інстытута фізікі нашай акадэміі. Ён — буйны фізік шырокага профілю, вядомы як тэарэтык і эксперыментатар. Выканаў шмат важных даследаванняў і апублікаваў многа работ. Барыс Барысавіч распрацаваў тэарэтычныя і эксперыментальныя асновы палярызацыйна - аптычнага метаду вывучэння працэсаў цячэння вязкіх асяроддзяў, выканаў шэраг даследаванняў па стварэнню новых лазерных канструкцый. Пад яго кіраўніцтвам створаны новыя лазеры. Адзін з іх — «Імпульс» — адзначаны залатым медалём ВДНГ СССР.

— Здаецца, ён стаў доктарам навук, мінуючы кандыдацкую ступень?

— Так, у 1965 годзе Барыс Бойка прадставіў для абароны кандыдацкую дысертацыю, і яму адразу прысвоілі званне доктара фізіка-матэматычных навук. Рэдкая з'ява!

— Акадэмікам стаў і галоўны вучоны сакратар акадэміі — прафесар Андрэй Дзмітрыеў.

— Андрэй Сяргеевіч — вядомы вучоны-фізіёлаг. У яго 69 навуковых работ, у тым ліку манаграфія «Лабірынтныя і экстралабірынтныя механізмы некаторых саматычных і вегетатыўных рэакцый на паскарэнне». Работы акадэміка Дзмітрыева вельмі актуальныя для далейшага развіцця сучаснай фізіялогіі, а таксама авіякасмічнай біялогіі і медыцыны. Дарэчы сказаць, ён быў дэлегатам Беларусі на першай канферэнцыі ААН па выкарыстанню касмічнай прасторы ў мірных мэтах, удзельнічаў у многіх усесаюзных і міжнародных канферэнцыях фізіёлагаў.

Па аддзяленні грамадскіх навук акадэмікам выбран буйны беларускі савецкі гісторык Іларыён Ігнаценка. У яго актыве — 120 навуковых работ, кіраўніцтва і ўдзел у выданні «Гісторыі БССР» у 5-ці тамах, «Нарысаў гісторыі Камуністычнай партыі Беларусі». Шырока вядомы такія яго работы, як «Бяднейшае сялянства — саюзнік пралетарыяту ў барацьбе за перамогу Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі», «Кастрычніцкая рэвалюцыя і сучасная ідэалагічная барацьба» і многія іншыя. Зараз акадэмік Ігнаценка ўзначальвае Інстытут гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

Чацвёрты з новых акадэмікаў — заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР, рэктар Беларускага політэхнічнага інстытута Пётр Яшчарыцын. Ён вядомы як буйны даследчык фундаментальных праблем тэхналогіі машынабудавання і аўтар распрацовак асноўных метадаў кіравання з'явамі тэхналагічнай спадчыннасці з мэтай забеспячэння неабходнай надзейнасці і даўгавечнасці дэталей, вузлоў машын і прыбораў. Вынікі яго даследаванняў шырока выкарыстоўваюцца ў падшыпнікавай прамысловасці не толькі ў нас, але і ў Чэхаславакіі, Польшчы, Венгрыі і іншых краінах.

— А цяпер раскажыце пра членаў - карэспандэнтаў...

— Пра акадэмікаў я сказаў вельмі мала, а пра новых членаў-карэспандэнтаў прыдзецца яшчэ менш — іх жа адзінаццаць. Гаворачы наогул, гэта таксама буйныя вучоныя, якія сваёй працай прынеслі вялікую карысць народу.

[Заканчэнне на 2-й стар.]

ЁН ЗМАГАЎСЯ ЗА ШЧАСЦЕ ЛЮДЗЕЙ У БЕЛАРУСІ, ІСПАНІІ, КІТАІ . . .
(«ЧАЛАВЕК З ЛЕГЕНДЫ») . . . . . стар. 4 — 5.

КАНДЫДАТ ФІЛАЛАГІЧНЫХ НАВУК Сцяпан ЛАЎШУК:
ФАНТАСТЫЧНАЯ КАМЕДЫЯ КАНДРАТА КРАПІВЫ «БРАМА НЕЎМІРУЧАСЦІ» — РОЗДУМ АБ ЧАЛАВЕЧНАСЦІ
. . . . . стар. 7.

У гэтым годзе работнікі Мінскага вытворчага аб'яднання «Гарызонт» абавязаліся перавыканаць план па рэалізацыі прадукцыі на 1 мільён 300 тысяч рублёў. Звыш задання будзе выпушчана 3 тысячы тэлевізараў і 2 тысячы радыёпрыёмнікаў.

НА ЗДЫМКУ: у адным з цэхаў прадпрыемства.

Фота Я. ПЯСЕЦКАГА.

ЯК СТАЦЬ АКАДЭМІКАМ

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.]

Коратка пра Міхаіла Бадзяку — загадчыка лабараторыі фізіка - тэхнічнага інстытута акадэміі. Яго можна назваць буйнейшым спецыялістам у галіне фізікі металаў і металазнаўства. Міхаіл Мікалаевіч стварыў і развіў новы напрамак у фізічным металазнаўстве — тэрмакінетыку структурных і фазавых пераўтварэнняў у металах і сплавах ва ўмовах высокіх скорасцей нагрэву, што з'яўляецца буйным укладам у навуку. Ад укаранення яго работ у металургію дзяржава атрымала вялікі эканамічны эфект.

Барыс Бокуць, рэктар Гомельскага універсітэта, выканаў 70 навуковых работ у галіне лінейнай і нелінейнай крысталаоптыкі. Аркадзь Іваноў зрабіў істотны ўклад у галіне люмінесцэнцыі, квантавай электронікі, цеплафізікі і іншых галін навукі, ён — аўтар 223 навуковых работ. Вынікі работ Валянціна Ткачова шырока прымяняюцца ў электроннай прамысловасці краіны. Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі Ігар Цітовіч шмат зрабіў для павышэння надзейнасці і даўгавечнасці асноўных агрэгатаў аўтамабіляў, трактараў і лакаматываў. Варта адзначыць, што ён удзельнічаў у распрацоўцы і ўдасканальванні айчынных аўтамабіляў, а яго канструкцыя каробкі перадач запатэнтавана ў ЗША, Англіі, Францыі і Італіі.

— Цікава было б даведацца аб грамадскай дзейнасці «маладых» акадэмікаў.

— Вы, як і многія іншыя, відаць, лічыце, што акадэмікамі і членкорамі становяцца толькі вучоныя сталага ўзросту. Гэта не зусім так. З сёлетняга папаўнення, напрыклад, Віктару Чачыну — 45 гадоў, Івану Ліштвану — 43, Андрэю Дзмітрыеву — 50, Валянціну Ткачову — 36. Наогул жа ўсе новыя акадэмікі і члены-карэспандэнты, як маладзейшыя так і старэйшыя, — актыўныя грамадскія дзеячы. Акадэмік Яшчарыцын— дэпутат Вярхоўнага Савета БССР, член Мінскага абкома партыі, Андрэй Дзмітрыеў — дэпутат Мінскага гарадскога Савета.

— Усе яны — камуністы?

— Не ўсе. Ігар Цітовіч і Аркадзь Іваноў — беспартыйныя.

— А па нацыянальнаму складу?

— Дзевяць беларусаў, пяць рускіх і адзін украінец.

— Большасць атрымала першапачатковую адукацыю тут, у Беларусі?

—Так. Галоўным чынам у вышэйшых навучальных установах Мінска, а таксама ў Гомелі, Маскве, Ленінградзе. Магу дадаць, што большасць з іх выхадцы з сем'яў сялян і рабочых.

— І цяпер з ліку моладзі рыхтуюць сабе змену?

— Паспяхова рыхтуюць. Акадэмік Ігнаценка выхаваў 20 кандыдатаў навук, а 9 яго вучняў ужо сталі дактарамі, Пётр Яшчарыцын падрыхтаваў 23 кандыдатаў, Ігар Цітовіч —21, Іван Ліштван — 10, Аркадзь Іваноў — 13, Юрый Казлоў — 11. Прыйдзе час, і іх вучні таксама стануць акадэмікамі.

— Раскажыце, Анатоль Якаўлевіч, якім чынам становяцца акадэмікамі.

— Акадэмікаў і членкораў выбіраюць. Першыя такія выбары адбыліся 28 снежня 1928 года і потым праходзілі 23 разы. Працэдура наступная.

Спачатку ў друку аб'яўляюцца вакансіі. Потым на гэтыя вакансіі саветы навуковых і вышэйшых навучальных устаноў, дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, акадэмікі і члены-карэспандэнты вылучаюць кандыдатаў. Пасля праходзяць выбары на агульных сходах аддзяленняў акадэміі. Тут за акадэмікаў галасуюць акадэмікі, за членкораў — акадэмікі і члены-карэспандэнты. Нарэшце, выбары адбываюцца на агульным сходзе Акадэміі навук, дзе права голасу маюць толькі акадэмікі. У абодвух выпадках галасаванне тайнае. А пасля выбараў друкуецца паведамленне ў газетах. Як бачыце, парадак выбараў строга дэмакратычны.

— Апошняе пытанне: колькі цяпер у Беларусі акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў?

— 61 акадэмік і 75 членаў-карэспандэнтаў. Гэтыя званні прысвоены ім пажыццёва.

— Дзякую. Ад імя рэдакцыі і чытачоў нашай газеты жадаю ім вялікіх навуковых поспехаў і творчых удач на карысць Радзімы.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ

У ПАЛЁЦЕ «МАЛАНКА-2»

У адпаведнасці з праграмай далейшага развіцця сістэм сувязі з выкарыстаннем штучных спадарожнікаў Зямлі 6 лютага 1975 года ў Савецкім Саюзе ажыццёўлен запуск на высокую эліптычную арбіту спадарожніка сувязі «Маланка-2» з бартавой рэтрансляцыйнай апаратурай, якая забяспечвае работу сістэмы ў сантыметровым дыяпазоне хваль.

Спадарожнік сувязі «Маланка-2» прызначаны для забеспячэння эксплуатацыі сістэмы далёкай тэлефонна-тэлеграфнай радыёсувязі ў Савецкім Саюзе, перадачы праграм Цэнтральнага тэлебачання СССР на пункты сеткі «Арбіта» і міжнароднага супрацоўніцтва.

ПЕРШАЯ ПРАДУКЦЫЯ НАФТАГІГАНТА

Галоўная тэхналагічная ўстаноўка Мазырскага нафтаперапрацоўчага завода выведзена на нармальны рэжым работы. Атрыманы першыя сотні тон высакаякаснага бензіну, дызельнага і кацельнага паліва.

Ганаровае права выпусціць першую прадукцыю атрымаў пераможца сацыялістычнага спаборніцтва — калектыў, які ўзначальвае старшы аператар устаноўкі Уладзімір Піражэнка.

ПАЛАЦ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

Юных гаспадароў прыняў Магілёўскі гарадскі палац піянераў. Тут дзесяткі памяшканняў для заняткаў гурткоў, вялікая канцэртная зала, спартыўны корпус з гімнастычнай залай і плавальным басейнам. У распараджэнне дзяцей прадастаўлены багатая бібліятэка, студыя выяўленчага мастацтва, фота - кіналабараторыя, класы для заняткаў аўтаматараў — усяго звыш ста кабінетаў, класаў і лабараторый. Адкрыты музей У. І. Леніна і гісторыі піянерскай арганізацыі Магілёўшчыны.

У новым палацы юныя ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці выступілі з вялікім канцэртам. Адбыліся спартыўныя спаборніцтвы школьнікаў.

НА НОВЫМ МЕСЦАНАРАДЖЭННІ

У ста пяцідзесяці кіламетрах ад Рэчыцы размясціўся трэці промысел нафтагазаздабываючага ўпраўлення «Рэчыцанафта». Верталёты за сорак пяць мінут дастаўляюць туды людзей і грузы. Тут, каля вёскі Мыслаў Рог, адкрыта новае месцанараджэнне нафты — Усходне-Вішанская плошча. Перспектыўнай аказалася прабураная свідравіна № 1. Туды тэрмінова былі пасланы мантажнікі.

Цяпер свідравіна дае звыш сотні тон «чорнага золата».

ПРАЦОЎНЫ РУБЕЛЬ — У ФОНД МІРУ

У Мінску адбылося пасяджэнне Беларускай рэспубліканскай камісіі садзейнічання Савецкаму фонду міру, на якім было, у прыватнасці, адзначана, што жыхары нашай рэспублікі актыўна ўдзельнічаюць у зборы сродкаў у фонд міру і ўнеслі ў яго ў мінулым годзе звыш мільёна 800 тысяч рублёў.

СПЕЦЫЯЛІСТЫ ЕДУЦЬ У ВЁСКУ

Адбыўся 22-гі выпуск спецыялістаў на трох факультэтах Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута. Дыпломы агранамаў і заатэхнікаў атрымалі амаль 250 чалавек. Усе яны накіраваны на работу ў калгасы, саўгасы і сельскагаспадарчыя арганізацыі рэспублікі.

Цяпер у інстытуце навучаецца звыш 2 600 студэнтаў, у тым ліку 1 550 завочнікаў, а таксама функцыяніруе факультэт, на якім штогод павышаюць кваліфікацыю каля трохсот спецыялістаў сельскай гаспадаркі.

ДЛЯ ПАКАЗУ Ў ПОЗНАНІ

Кінематаграфісты аб'яднання «Летапіс» студыі «Беларусьфільм» прыступілі да работы над новай дакументальнай стужкай, якая раскажа пра гіганты беларускага машынабудавання — Мінскі трактарны і аўтамабільны заводы, а таксама пра Акадэмію навук БССР, Беларускі дзяржаўны універсітэт і іншыя прадпрыемствы і ўстановы.

Кінафільм будзе паказаны на міжнародным прамысловым кірмашы, які адкрыецца ў чэрвені гэтага года ў Познані.

Да ўраджаю 1975 года пачалі падрыхтоўку хлебаробы саўгаса «Цімانава» Клімавіцкага раёна. Пад прапашныя культуры тут запланавана ўнесці не менш як 50 тысяч тон арганічных угнаенняў. У гаспадарцы працуе спецыялізаванае звяно з 12 трактараў і 10 аўтамашын. Штодзённа яно вывозіць на палі да 600 тон арганікі.

НА ЗДЫМКУ: вывазка ўгнаенняў на палі цэнтральнай сядзібы саўгаса.

Фота М. ЖАЛУДОВІЧА.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ

ГЕОГРАФИЯ СВЕРХМОЩНЫХ—ВСЯ СТРАНА

В КАЛЕЙДОСКОПЕ ОЖИДАЕМЫХ СОБЫТИЙ ЭКОНОМИЧЕСКОЙ ЖИЗНИ В СССР В 1975 ЗАВЕРШАЮЩЕМ ГОДУ ДЕВЯТОЙ ПЯТИЛЕТКИ НЕ ТАК-ТО ПРОСТО ВЫДЕЛИТЬ ОСОБО ЗНАЧИМЫЕ — НАСТОЛЬКО НАПРЯЖЕННЫ ПЛАНОВЫЕ ЗАДАНИЯ, НАСТОЛЬКО ДИНАМИЧЕН ХАРАКТЕР РАЗВИТИЯ ОГРОМНОГО ПО МАСШТАБАМ НАРОДНОГО ХОЗЯЙСТВА СТРАНЫ.

ЗНАМЕНАТЕЛЬНО, что эстафету новому году передал декабрьский пуск крупнейшей в мире доменной печи объемом пять тысяч кубических метров в Кривом Роге и ввод в строй также невиданного ранее по мощности сталелитейного кислородно-конверторного цеха (четыре миллиона тонн высококачественной стали в год) на Новолипецком металлургическом заводе. По сравнению с ними пусковой объект 1975 года в городе Темиртау (Казахская ССР) — домна № 4 может показаться не столь уж значительным. А ведь она будет давать в год миллион восемьсот тысяч тонн чугуна!

Создание таких мощных промышленных агрегатов вызвано тем, что народному хозяйству страны нужно много металла, справедливо называемого «фундаментом» индустрии. К тому же требуется металл высокого качества и недорогой по себестоимости. А этот выигрыш не только количественный, но и по качеству, экономичности дают объекты, как говорят специалисты, с большой единичной мощностью, с высокой степенью механизации и автоматизации всех технологических процессов. И названные агрегаты сегодня определяют современный наивысший уровень мировой металлургии.

К ним надо причислить и новый широкополосный стан горячей прокатки «2000», который вступит в строй на «Северной Магнитке» — Череповецком металлургическом заводе. На нем за 80—100 секунд раскаленная заготовка десятиметровой длины весом 36—45 тонн будет превращаться в тонкую стальную полосу длиной свыше километра, смотанную в рулон. Три миллиона тонн высококачественного проката в год — такова проектная мощность первой очереди этого стана.

НЕСОМНЕННЫЙ интерес, причем не только по своей народнохозяйственной значимости, но и в научно-техническом плане, представляет одна из крупнейших энергетических новостроек в Средней Азии. На реке Нарын в Киргизии завершается строительство третьей

ПРАГРАМА ПАСПЯХОВА ВЫКАНАНА

Экіпаж станцыі «Салют-4» на Зямлі

ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

9 лютага 1975 года ў 14 гадзін 03 мінуты маскоўскага часу пасля выканання 30-сутачнай праграмы даследаванняў на борце пілатуемай навуковай станцыі «Салют-4» і транспартнага карабля «Саюз-17» касманаўты таварышы Аляксей Аляксандравіч Губараў і Георгій Міхайлавіч Грэчка вярнуліся на Зямлю.

Прызямленне спускаемага апарата транспартнага карабля «Саюз-17» адбылося ў разліковым раёне тэрыторыі Савецкага Саюза ў 110 кіламетрах на паўночны ўсход ад горада Цалінаграда.

Самаадчуванне касманаўтаў пасля прызямлення добрае.

Пры падрыхтоўцы да спуску на Зямлю касмачаўты перанеслі ў транспартны карабель «Саюз-17» матэрыялы навуковых даследаванняў, касеты з фота- і кінаплёнкай, бартавыя журналы, пасля чаго закрылі ўнутраны люк-лаз.

У 9 гадзін 08 мінут маскоўскага часу была праведзена расстыкоўка транспартнага карабля «Саюз-17» і станцыі «Салют-4». Перад спускам з арбіты экіпаж правёў арыентацыю карабля, потым была ўключана тармазная рухальная ўстаноўка. Пасля заканчэння работы рухавіка адбылося раздзяленне адсекаў карабля, і спускаемы апарат перайшоў на траекторыю зніжэння.

На вышыні сямі кіламетраў была ўведзена ў дзеянне парашутная сістэма, непасрэдна каля паверхні Зямлі спрацавалі рухавікі мяккай пасадкі, пасля чаго спускаемы апарат плаўна прызямліўся.

Пасадка спускаемага апарата праходзіла ў складаных метэаралагічных умовах пры скорасці ветра 20 метраў у секунду, вышыні воблачнасці 150 метраў і бачнасці 500 метраў.

Медыцынскае абследаванне, праведзенае на месцы прызямлення, паказала, што таварышы Губараў і Грэчка добра перанеслі працяглы касмічны палёт.

У ходзе працяглага касмічнага палёту ажыццёўлен вялікі комплекс даследаванняў Сонца, планет і зорак у розных дыяпазонах спектру электрамагнітных выпраменьванняў, прадоўжана вывучэнне зямной паверхні і атмасферы ў інтарэсах навукі і народнай гаспадаркі, выканан шырокі круг медыка-біялагічных даследаванняў па далейшым вывучэнні ўплыву фактараў касмічнага палёту на жыццядзейнасць чалавека.

На працягу палёту сувязь з касмічным караблём «Саюз-17» і станцыяй «Салют-4» надзейна забяспечвалася сродкамі наземнага камандна-вымяральнага комплексу, які ўключае ў сябе вымяральныя пункты, размешчаныя на тэрыторыі Савецкага Саюза, і навукова-даследчыя судны Акадэміі навук СССР «Акадэмік Сяргей Каралёў», «Рыстна» і «Невель», якія знаходзяцца ў акваторыі Атлантычнага акіяна.

Пошукава-выратавальны комплекс у складанай метэаралагічнай абстаноўцы забяспечыў хуткае выяўленне спускаемага апарата і эвакуацыю касманаўтаў.

Намечаная праграма навукова-тэхнічных даследаванняў і эксперыментаў у сумесным палёце станцыі «Салют-4» і транспартнага карабля «Саюз-17» паспяхова выканана. Атрыманыя даныя апрацоўваюцца і вывучаюцца.

Станцыя «Салют-4» працягвае палёт у аўтаматычным рэжыме.

Здабыча і вытворчасць мінеральных угнаенняў—адна з вядучых галін хімічнай прамысловасці ў рэспубліцы. Здаецца, зусім нядаўна на Старобінскую плошчу прыйшлі першыя геолагі, а вось ужо каля нікому не вядомай вёсачкі Чыжэвічы вырас горад шахцёраў Салігорск. На глыбіні 400 метраў знаходзяцца 140 горнапраходчых і здабываючых камбайнаў, 440 самаходных вагонаў, трактараў і аўтамашын. Працягласць канвеерных ліній, якія нясуць сільвініт да скіпа, — 170 кіламетраў.

НА ЗДЫМКАХ: перадавыя шахцёры Г. СЯЎРУК, Б. АСАНАЎ і В. ЛАХОВІЧ; у забой ідзе чарговая змена; высокакваліфікаваныя кадры гарнякоў рыхтуе Салігорскае горна-хімічнае вучылішча імя Марыса Тарэза.

БЕЛАРУСКІЯ САМАЗВАЛЫ

У 32 краіны свету экспартуюцца беларускія самазвалы. У 1974 годзе да ліку імпарцёраў прыбавілася Францыя, якая сама выпускае машыны вялікай грузападымальнасці.

Чым жа прыцягнулі да сябе ўвагу машыны Беларускага аўтамабільнага завода? Дырэктар завода Мікалай Усанькоў адказвае коратка: «Высокай прадукцыйнасцю, надзейнасцю, камфортам».

Яго словы пацвярджаюць чатыры залатыя медалі, якія атрымалі трыццацітонны БелАЗ-540 і саракатонны БелАЗ-548А на міжнародных выстаўках у Лейпцыгу і Плоўдзіве.

Тысячы беларускіх самазвалаў працуюць сёння ў 400 гаспадарках нашай краіны. Іх можна сустрэць на самых адказных будоўлях. Толькі ў 1973 годзе гэтыя выслівыя машыны перавезлі каля 2,5 мільярда тон грузаў, што роўна амаль палавіне ўсіх аўтаперавозак у кар'ерах краіны.

Нядаўна з эксперыментальнага цэха завода выйшла новая вялікагрузная машына — 75-тонны самазвал БелАЗ-549. Шырыня яго пяць метраў, а казырок платформы падымаецца ад зямлі на 4,5 метра. Побач з колам гэтага гіганта чалавек здаецца карлікам.

Новая машына, як і яе папярэдніцы, пабудавана з адступленнем ад класічнай схемы. У ёй, напрыклад, няма каробкі перадач, карданнага вала, задняга моста. Дызель звязан з генератарам пастаяннага току 500 кілават. Энергія ад яго ідзе па правадах да электрамоторaў, якія ўманціраваны ў колы. Кожнае кола мае незалежную падвеску. Гэта забяспечвае надзейнае счапленне з дарогай.

Нягледзячы на знешнюю грувасткасць, машына манеўраная, лёгкая і простая ў кіраванні.

Усе выпрабаванні 950-сільны гігант БелАЗ-549 прайшоў паспяхова. Дзяржаўная камісія рэкамендавала яго да серыйнага выпуску. Першы такі аўтамабіль сыйдзе з канвеера ў 1976 годзе. Цяпер ідзе рэканструкцыя прадпрыемства.

Не паспелі 75-тонныя машыны атрымаць афіцыйнае прызнанне, як на выпрабаванні ў сібірскія кар'еры пайшлі два 120-тонныя гіганты. Між іншым, дынастыя жодзінскіх волатаў на гэтым не завершыцца. На кульманах канструктараў нараджаюцца абрысы 180-тоннай, выношваюцца ідэі 300-тоннай машыны...

І. АСІНСКІ.

ЗАВОДСКІ МУЗЕЙ

На старэйшым прадпрыемстве Гомеля — вагонарамонтным заводзе імя Калініна ёсць свой гістарычны музей. Стэнды, вітрыны і стэлажы, на якіх экспануецца больш як тысяча фотаздымкаў, фотакопій і сапраўдных дакументаў, адлюстроўваюць стогадовую гісторыю завода і яго калектыву.

Адзін са стэндаў прысвечаны жыццю і дзейнасці М. І. Калініна, які наведаў завод у першыя гады Савецкай улады на Гомельшчыне.

Вялікае месца ў музеі займаюць матэрыялы, прысвечаныя першым выступленням рабочых прадпрыемства супраць царскага самадзяржаўя, іх удзелу ў забастоўцы 1905 года, у рэвалюцыйных падзеях 1917 года, у грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнах, а таксама працоўным поспехам калектыву завода ў гады даваенных і пасляваенных пяцігодак. Гэты багаты гістарычны матэрыял выкарыстоўваецца саветам музея пры правядзенні экскурсій, сустрэч рабочай моладзі з ветэранамі завода, піянерскіх збораў падшэфных школ.

У музеі ёсць магнітафонная стужка з запісам перадачы Беларускага радыё аб патрыятычных справах гомельскіх вагонарамонтнікаў у суровыя гады Вялікай Айчыннай вайны.

Цяпер савет музея рыхтуе новую экспазіцыю, прысвечаную 30-годдзю Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй.

гидроэлектростанции из каскада «фабрик электричества» — Токтогульской ГЭС. Ее мощность — миллион двести тысяч киловатт — отнюдь не рекордная для советской гидроэнергетики. Но ежегодная прибавка в объединенную энергетическую сеть Средней Азии почти в четыре с половиной миллиарда киловатт-часов, несомненно, солидна.

И дело не только в этой прибавке. За бетонной плотиной проектной высотой 215 метров образуется искусственное море живительной влаги объемом около двадцати миллиардов кубических метров. Оно позволит оросить и, следовательно, ввести в сельскохозяйственный оборот почти полмиллиона гектаров целинных и залежных земель плюс повысит поливы еще на площади более 900 тысяч гектаров.

Нельзя не отметить и другую особенность Токтогульской ГЭС. Она возводится в отрогах Тянь-Шаня, в узком ущелье сейсмической зоны на тысячеметровой высоте над уровнем моря. Проектировщикам и строителям пришлось преодолеть там немало трудностей. Впервые в мировой практике гидроэнергостроения агрегаты станции (четыре по 300 тысяч киловатт каждый) устанавливаются не фронтально, а в два этажа (из-за узости каньона). Удачно удалось решить и проблему сейсмостойкости. Специалисты уверяют, что благодаря расположению плотины и здания гидроэлектростанции в пределах единого мощного структурно - тектонического скального блока практически исключена опасность разрушений или крупных повреждений даже в случае сильного землетрясения.

Сотни новых предприятий, оборудованных по последнему слову техники, появятся на карте страны за 1975 год. Всех их не перечесть. Отметим лишь, что этот год будет ударным по приросту мощности в легкой и пищевой промышленности, химии и нефтехимии, индустрии «голубого топлива» и «витаминов плодородия». Советский Союз занимает сейчас первое место в мире по производству минеральных удобрений. Но и потребность в них еще полностью не удовлетворена. Поэтому большое значение придается пусковым стройкам этой отрасли в 1975 году: будут введены новые мощности на 10,3 миллиона тонн.

ЗНАЧИТЕЛЬНЫЕ изменения произойдут в 1975 году в связи с успешно выполняемой социальной программой. Отметим лишь область прироста денежных доходов населения. Он за четыре минувших года уже превысил сумму, на которую увеличились реальные доходы советских людей за период восьмой пятилетки. Заработная плата возросла у 47 миллионов человек, свыше 30 миллионов человек получили денежную прибавку в результате повышения пенсий, стипендий и пособий. В 1975 году наступает очередь центральных, наиболее густо населенных районов страны, где будут осуществлены последовательно проводимые мероприятия по повышению заработной платы (увеличение минимума заработков, тарифных ставок и окладов среднеоплачиваемой категории рабочих и служащих). А это значит, что меры по повышению народного благосостояния, намеченные на XXIV съезде КПСС, коснутся каждой советской семьи.

Юрий КАНИН.
АПН.

Віцэ-адмірал Георгій Халасцякоў нарадзіўся ў Баранавічах у мнагадзетнай сям'і машыніста, тут прайшло яго дзяцінства, тут атрымаў юнак першыя ўрокі палітычнай барацьбы.
У 1920-м стаў камуністам. Вучыўся, горача адгукаўся на ўсе падзеі, якія адбываліся ў той час у краіне, стаў матросам. Мора захапіла. Вайна застала яго на Чорным моры, камандзірам Новарасійскай ваенна-марской базы. А потым Георгій Мікітавіч камандаваў Дунайскай флатыліяй. Дзвесце караблёў яе прайшлі з баямі больш як дзве тысячы кіламетраў і прымалі ўдзел у вызваленні Венгрыі, Чэхаславакіі, закончыўшы свой баявы шлях у Вене. Грудзі віцэ-адмірала Халасцякова ўпрыгожваюць тры ордэны Леніна, тры — Чырвонага Сцяга, ордэн Суворава I ступені, два ордэны Ушакова I ступені, ордэн Айчыннай вайны і вышэйшая ўзнагарода Радзімы — Залатая Зорка Героя Савецкага Саюза.
Пайшоўшы ў адстаўку, віцэ-адмірал Г. Халасцякоў заняўся грамадскай дзейнасцю. Ён шмат ездзіць па краіне, часта сустракаецца з моладдзю, вядзе па Цэнтральнаму тэлебачанню праграму «Шукальнікі».

НА ЗДЫМКУ: віцэ-адмірал Г. ХАЛАСЦЯКОЎ сярод чырвоных следапытаў школы № 12 горада Баранавічы.

Фота У. ЛУПЕЙКІ.

ЯНЫ

Прызнацца, я ўжо забыўся і на той па-летняму цёплы красавіцкі дзень, і на тую ўрачыстую цішыню, якой нас сустрэлі залы музея, і на гэты фотаздымак.

Хаця цяпер прыпамінаю: ён вісеў на стэндзе ля самага акна. Ніжэй, пад шклом, ляжалі ці то газеты, ці то якія сшыткі. А яшчэ, памойму, быў там піянерскі гальштук. Але вельмі ўжо на выгляд непрывабны: зроблены з марлі і пафарбаваны ў нейкі бурачкова-маркоўны колер. Тады я толькі зірнуў на ўсё гэта і, не затрымліваючыся, накіраваўся да партызанскай пушкі.

Ішоў сорак дзевяты год. Даўно вярнуліся з фронту салдаты. У наш дзіцячы дом першым прыехаў бацька Віцькі Яфімава. Вусы вялізныя, на гімнасцёрцы — ордэны. Падхапіў ён Віцьку, прыціснуў да сябе, нам жа пасля сказаў:

— Чакайце хлопчыкі! І вашы бацькі хутка прыедуць!

І мы чакалі... Праходзілі дні, тыдні, гады... І мы, нарэшце, зразумелі, што, на жаль, не ўсе вяртаюцца з фронту, нават і пасля перамогі.

...Стары-экскурсавод спрабаваў адцягнуць нашу ўвагу ад пушкі і паказваў на іншыя экспанаты. Памятаю, ён нешта доўга расказваў і пра гэты фотаздымак, раіў усё:

— Прыгледзьцеся, гэты дакумент для нас асабліва цікавы. Вось так вучыліся дзеці ў партызанскай школе.

І сапраўды: проста пад елкамі сядзяць хлапчукі, пасярэдзіне гарыць касцёр. Да тоўстага дрэва прыбіта дошка. Каля яе стаіць нейкая жанчына. Па ўсім відаць, настаўніца. Мы глядзелі на гэты здымак і, прызнацца, здзіўляліся: што ў ім цікавага знайшоў стары?.. Вучацца! Ну і што?! Заўтра панядзелак, і ў нас пачнуцца заняткі.

Шчыра кажучы, мы вельмі ўзрадаваліся, калі экскур-

На просторах Родины

ДАЛЬНЕВОСТОЧНЫЙ НАУЧНЫЙ ЦЕНТР

Дальний Восток представляет собой уникальный естественный полигон для изучения целого ряда глобальных научных проблем. Здесь проходит граница между самым большим океаном планеты — Тихим — и самым большим ее континентом — Евразиатским. Вдоль этой границы тянется мощная цепь вулканов Курильской гряды и Камчатки, рядом с ними проходит глубоководная впадина в дне океана. Здесь зона сильнейших землетрясений, вулканических извержений, цунами. Необыкновенно богаты и неповторимы флора и фауна Дальнего Востока. Все это имеет не только большой научный интерес. Советский Дальний Восток — край богатейших природных ресурсов, широкое освоение которых, по сути дела, еще только начинается.

Ускоренное экономическое и социальное развитие этого важного региона страны, намеченное в ряде решений ЦК КПСС и Совета Министров СССР, потребовало значительного укрепления и развития науки на Дальнем Востоке. 1 октября 1970 года на базе нескольких местных академических научных учреждений был создан Дальневосточный научный центр Академии наук СССР. Сегодня он объединяет 15 институтов и много других научных учреждений, где занято в общей сложности около 6,5 тысячи сотрудников.

В соответствии со спецификой региона в ДВНЦ полнее всего представлены науки о Земле. В этом направлении работают Дальневосточный геологический институт тектоники и геофизики, Северо-восточный и Сахалинский комплексные научно - исследовательские институты, Институт вулканологии.

Широкий круг геологических, физических и биологических исследований проводит Тихоокеанский океанологический институт. Тихоокеанский институт географии работает над проблемой взаимодействия географической среды и человека, что должно сыграть важную роль в разработке стратегии развития производительных сил Дальнего Востока. Мы должны предусмотреть такую систему использования природных ресурсов, при которой природе будет причинен минимальный ущерб. Красота и неповторимость дальневосточной природы должна быть сохранена для потомков.

В ДВНЦ много биологических учреждений. Это Биологопочвенный институт, Институт биологии моря, Институт биологических проблем Севера, Ботанический сад, заповедники и т. д. Изучаемые биологами вопросы можно разделить на три группы: биогеоценология, биологические ресурсы Дальнего Востока, проблемы эволюции; проблемы морской биологии; проблемы адаптации организмов к экстремальным условиям среды. Особенно важны исследования морских биологов. Ведь в воде обитает 4/5 всех живых существ планеты.

В области химических наук исследования ведутся в Тихоокеанском институте биоорганической химии, задачей которого является химическое, биологическое и физиологическое изучение биологически активных веществ флоры и фауны Дальнего Востока, включая и морские объекты. Институт химии ведет разработку научных основ переработки минерального сырья Дальнего Востока, в том числе ресурсов моря, проводит исследования физико-химических свойств, кристаллической и электронной структуры комплексных соединений и химической связи в них.

Исторический опыт социалистического и коммунистического строительства на Дальнем Востоке, развитие хозяйства, быта, культуры Дальнего Востока, вопросы этногенеза аборигенного населения северо-восточной Азии изучают сотрудники Института археологии, истории и этнографии народов Дальнего Востока. Исследования, необходимые для оптимального планирования и прогноза развития народного хозяйства, проводят наши экономисты.

В некоторых вопросах институты ДВНЦ занимают ведущее положение среди научных учреждений Академии наук СССР. Тихоокеанский институт биоорганической химии завоевал мировое признание химическими и биохимическими исследованиями на морских организмах. Успешно развивает биологическое изучение шельфа, проводит исследования по физиологии и генетике лососевых Институт биологии моря. Головным в нашей стране по проблеме цунами является Сахалинский комплексный научно-исследовательский институт, по проблеме тихоокеанского рудного пояса — Дальневосточный геологический институт. Важные сейсмические и геофизические исследования проводятся в единственном пока в мире специализированном Институте вулканологии. В Институте тектоники и геофизики завершены начатые в Сибирском отделении Академии наук СССР крупные обобщающие работы по тектонике докембрия и перспективам его газоносности. Крупные научные достижения имеют наши историки и этнографы.

Ученые ДВНЦ подготовили для использования в народном хозяйстве свыше 50 разработок. Среди них — методы определения нахождения рыбных стад, принципиальная схема извлечения ценных компонентов из прибрежных россыпей, медицинские препараты «Сантарин» и «Рантарин», методы разведения рыб и морских беспозвоночных, метод окраски судов, методы и районы поиска важнейших для Дальнего Востока металлов, нефти и газа.

Многие природные структуры Дальнего Востока пролегают по территории нескольких сопредельных стран. Их успешное изучение можно вести только объединенными усилиями. Тихий океан может и должен стать океаном международного сотрудничества ученых, океаном дружбы. Это позволит скорее создать научные основы эксплуатации и воспроизводства разнообразных ресурсов океана и побережий и повысит благосостояние народов всех стран Тихоокеанского бассейна.

А. КАПИЦА,
председатель Президиума Дальневосточного научного центра Академии наук СССР,
член-корреспондент АН СССР.



Флот Грузинского морского пароходства пополнился новым сухогрузом-рудовозом, построенном на судоверфи Щецина в Польской Народной Республике. На этом судне, которому присвоено имя грузинского поэта Георгия Леонидзе, используются новейшие достижения электронной техники. Управление главным двигателем и другими механизмами осуществляется с центрального пульта и из рулевой рубки. Грузоподъемность «Георгия Леонидзе» — около 32 000 тонн. Мощность главного двигателя — 12 000 лошадиных сил. Экипажу обеспечены все удобства: на судне 38 кают, два салона, две столовых, библиотека, спортзал, плавательный бассейн.

НА СНИМКЕ: новый сухогруз-рудовоз «Георгий Леонидзе».

ЧАЛАВЕК З ЛЕГЕНДЫ

80 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ К. АРЛОЎСКАГА

Бясстрашны і суровы воін, аб якім і да гэтага часу ходзяць легенды. Селянін, які пяшчотна любіў зямлю і набыў над ёю ўладу. Чалавек бязмежнай мужнасці, цвёрдасці духу і непахіснай волі... Такі Кірыла Пракопавіч Арлоўскі. Калі ён выступаў з трыбуны сесіі Вярхоўнага Савета СССР, пленума Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі або іншага прадстаўнічага форуму, здавалася, што яго голас яшчэ не перастаў гучаць і ў гарах Іспаніі, і на раўнінах Кітая, і ў партызанскіх пушчах роднай Беларусі...

Кірыла Пракопавіч нарадзіўся 30 студзеня 1895 года ў вёсцы Мышкавічы (цяпер Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці). З дзіцячых гадоў дапамагаў па гаспадарцы бацьку, ва ўсёй паўнаце зведаўшы цяжкую сялянскую працу. І часта, на якой бы рабоце ні быў — з віламі або цэпам, з плугам або сякерай, юнаку мроіўся выгляд новых Мышкавічаў. Прамыя і роўныя вуліцы, патанаючыя ў зеляніне, дабротныя дамы.. Але як гэтага дабіцца, Кірыла тады не ведаў.

Радасныя юнацкія летуценні рассеяліся, калі ў 1915 годзе яго забралі ў салдаты. Маючага прыродны розум Арлоўскага накіравалі ў вучэбную каманду. У 1917 годзе ён прыехаў на заходні фронт унтэр-афіцэрам. Суседнім узводам камандаваў петраградскі рабочы-бальшавік Аляксандр Анісімаў. Усёй ду-

АБАРАНЯЛІ НАША ДЗЯЦІНСТВА

савода раптам нехта паклікаў да тэлефона. Усе — зноў бягом да пушкі. Тут можна ўявіць сябе ў баі. Сціснуць да болю ў пальцах спускавы шнур, прыпасці да шкельца прыцэлу, у думках скамандаваць:

— Па фашыстах агоны!.. Ага, пабеглі... Гэта вам за бацьку, гады! Агоны!.. Агоны!..

...З таго часу мінула шмат вёсен. Неяк у ліпені па заданню рэдакцыі мне давялося доўгі час працаваць у Мінску, у архіве музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. І вось тут я выпадкова зноў натрапіў на гэты фотаздымак. Адразу ўспомніліся дзіцячы дом і тая, ужо цяпер такая далёкая паездка ў Пінск.

Я доўга ўзіраўся ў твары дзяцей, думаў, кім сталі яны? І як склаўся лёс гэтай дзяўчыны-настаўніцы? Навокал лес, голад, смерць, а яна вучыць дзяцей, тых дзяцей, якіх фашызм іменаваў не інакш як «заўтрашняя рабочая жывёла».

Вось дакумент, які раскрывае змест гутаркі Гітлера з Гімлерам. Кіраўнік эсэсаўцаў, вярнуўшыся з Мінска, выказаў думку, што на акупіраванай тэрыторыі не варта знаёміць дзяцей з геаграфіяй, гісторыяй. Яны павінны ўмець толькі чытаць і разборліва пісаць сваё прозвішча. Гітлер тут жа запярэчыў: «Не, вучыць чытаць, бадай, не варта! Няхай умеюць толькі лічыць да ста. Нам патрэбна рабочая жывёла, а прасцей кажучы, — рабы!»

Я чытаў гэтыя радкі, і мне станавілася ўсё больш зразумелым, чаму з такой дзелавітай паслядоўнасцю гітлераўцы не толькі рабавалі, але і знішчалі нашы музеі, помнікі даўніны, палілі кнігі Талстога, Чэхава, Гісторыя, культура кожнага народа — гэта яго гордасць, частка нацыянальнай самасвядомасці, гэта яго аблічча і характар. Народ без традыцый, без гісторыі, без годнасці — мара кожнага прыгнятальніка. Рабы павінны быць безаблічнымі цені, не мець ні мінулага, ні будучага.

А будучае народа — яго дзеці. І таму ў сваім пачварным плане «Ост» фашызм удзяліў ім асаблівую ўвагу. Прывяду толькі некалькі радкоў з гэтага плана: «Не дапускаць барацьбы за знішчэнне смяротнасці дзяцей. Не дазваляць навучанне маці догляду за немаўлятамі, прафілактычным мерам супраць дзіцячых захворванняў... Не аказваць ніякай дапамогі і падтрымкі дзіцячым садам і іншым падобным установам».

А вось як ажыццяўлялася на акупіраванай Беларусі тое, што было вынашана ў цішы берлінскіх кабінетаў. 27 верасня 1942 года эсэсаўцы наладзілі аблаву на вуліцах Мінска. Толькі ў раёне вакзала імі было схоплена сто дзяцей сірот. Усе яны тут жа былі расстраляны.

А пасля на зямлі Беларусі і Украіны была праведзена спецыяльная аперацыя. На працягу некалькіх дзён былі адпраўлены ў Германію на прымусовую працу і для далейшага анямечвання 50 тысяч дзяцей ва ўзросце ад 10 да 14 гадоў.

...Я зноў і зноў перачытваў гэтыя дакументы, адзін страшнейшы за другі, а перад вачамі стаяла яна, настаўніца партызанскай школы. Мяркуючы па фотаздымку, яшчэ зусім дзяўчынка! А вось знайшла ў сабе мужнасць і сілу, каб здзейсніць такі подзвіг. Іменна подзвіг — інакш не назавеш! У той чорны час акупацыі, ва ўмовах страху і гора кожныя такія заняткі сцвярджалі не толькі веру ў перамогу, але і няўхільнасць яе. Наперакор ворагу, самой смерці працягвалася гэта адвечнае, святое: «Ма-ма мы-ла ра-му». Ці не ў гэтым і заключаўся вялікі сэнс тых пакут, жорсткіх нягод, якія прыняў на сябе наш народ, абараняючы свабоду.

...На адвароце фотаздымка з цяжкасцю я прачытаў подпіс, зроблены наспех алоўкам: «Брэсцкае партызанскае злучэнне». Пасля даведаўся, што дзяўчына-настаўніца на фотаздымку — Ядвіга Чарняўская, цяпер кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры рускай літаратуры Брэсцкага педінстытута.

Тады я і вырашыў абавязкова з'ездзіць у Брэст, сустрэцца з гэтай мужнай жанчынай.

...У кожнага быў свой пачатак вайны, свая хвіліна, якая адкрыла лік горкім стратам. Для Ядвігі Антонаўны ўсё гэта здарылася тут, у Брэсце. Раніцой прачнулася, а ў горадзе ўжо немцы. На вуліцы — чужыя танкі, чужая мова.

Ядвіга Антонаўна, не адрываючыся, доўга глядзіць на агні за акном. Маўчу і я, адчуваю: не пра ўсё лёгка ўспамінаць нават і цяпер, праз многія гады.

Удзень — чуткі, безвыходныя, страшныя: «Немцы, кажуць, Маскву ўзялі!..» Па начах — гулкі, мерны стук каваных ботаў патруля: тук-тук, тук-тук. На сценах загады, аб'явы, дзе кожны параграф заканчваецца словамі «будуць расстраляны...»

(Заканчэнне на 6-й стар.)

шой пацягнуўся да яго Кірыла. У дні франтавога зацішша былы пуцілавец расказваў яму аб Леніне, аб створанай ім партыі, аб барацьбе бальшавікоў за шчасце людзей працы. Гутаркі гэтыя для Арлоўскага сталі першым класам «палітычнай школы». Зусім іншым чалавекам пакінуў ён акопы пасля перамогі Вялікага Кастрычніка.

Але мірнае жыццё было кароткім. Над маладой Рэспублікай Саветаў згушчаліся навальнічныя хмары. У 1918 годзе, калі Беларусь акупіравалі кайзераўскія войскі, Арлоўскі стварыў партызанскі атрад, які пасля вызвалення родных месц уліўся ў чырвонагвардзейскія часці. Тады ж, у снежні 1918 года, Кірыла Арлоўскі быў прыняты ў рады ленінскай партыі. Павятовы камітэт накіраваў яго на работу ў ЧК у Бабруйск.

У красавіку 1919 года храбрага партызанскага важака пасылаюць у Маскву на курсы каманднага саставу Чырвонай Арміі. Лекцыі часта змяняліся баямі. Арлоўскі змагаўся з ворагамі пад Барысавам і Бабруйскам, Полацкам і Фёдараўскім Пасадам, каля Петраграда. У аўдыторыях і баях спасцігаючы ваенныя навукі, ён у сакавіку 1920 года скончыў Першыя маскоўскія пяхотныя курсы.

У красавіку таго ж года ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі прыняў рашэнне аб аказанні дапамогі мясцовым падпольным арганізацыям у разгортванні партызанскага руху ў тыле белапольскіх захопнікаў. У ліку іншых выбар выпаў і на Арлоўскага — былога франтавіка і партызанскага камандзіра. «Я ахвотна згадзіўся», — пісаў ён пазней аб гэтым.

У пушчах і багнах Палесся Кірыла Пракопавіч арганізоўваў баявыя атрады для барацьбы з белагвардзейскімі бандамі Булак-Булаховіча, з «зялёнымі», якія арудавалі ў лясах. Пасля дапамагаў патрыётам Заходняй Беларусі змагацца са сваімі прыгнятальнікамі.

Вярнуўшыся ў Маскву, стаў студэнтам Камуністычнага універсітэта народаў Захаду. Пасля заканчэння вучобы яго накіроўваюць у Беларусь. За ўзорнае выкананне спецыяльнага задання ўрада Арлоўскі ўдастойваецца вышэйшай у той час узнагароды рэспублікі — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Затым працяг службы ў органах дзяржбяспекі Беларусі, работа на будаўніцтве канала Масква—Волга.

Летам 1936 года, калі ў Іспаніі адбыўся фашысцкі мяцеж, К. Арлоўскі, падпарадкоўваючыся закліку сэрца і высокаму інтэрнацыянальнаму абавязку, ідзе добраахвотнікам абараняць свабоду і незалежнасць далёкай Іспанскай Рэспублікі. І тут вельмі спатрэбіліся яго багаты баявы вопыт, майстэрства партызана, чэкіста і падпольшчыка, яго цвярозы воінскі разлік, незвычайная смеласць і невычарпальная кемлівасць.

У Іспаніі Арлоўскі стаў саветнікам у інтэрнацыянальных разведвальна-дыверсійных атрадах — герыльерас, як іх называлі. Барселона, Валенсія, Алікантэ, Мурсія, Уэльва, Мадрыд... У барацьбе з іспанскімі і германа-італьянскімі фашыстамі Арлоўскі скалясіў і аблазіў у варожым тыле сотні горных дарог і дзікіх звярыных сцежак, набыў шмат новых сяброў.

Пасля паражэння рэспубліканцаў Кірыла Пракопавіч тайнымі шляхамі вярнуўся ў Савецкі Саюз. Але ненадоўга: з сакавіка 1941 па май 1942 года чэкіст Арлоўскі, падобна на Рыхарда Зорге, Льва Маневіча і іншых савецкіх разведчыкаў, выконваў важнае заданне Радзімы далёка за межамі СССР.

Але яго мяцежнае сэрца рвалася ў Беларусь, акупіраваную фашысцкімі захопнікамі. Кірыла Пракопавіч просіць Цэнтр накіраваць яго ў тыл для барацьбы з акупантамі. Летам 1942 года настойлівую просьбу разведчыка задаволілі. Яму было даручана арганізаваць атрад спецыяльнага прызначэння і дзейнічаць у лясах пад Баранавічамі, там, дзе прайшла яго партызанская маладосць.

Шмат было перададзена Арлоўскім падрабязных і каштоўных звестак у Цэнтр, шмат праведзена смелых аперацый, у тым ліку і па знішчэнню гебітскамісара Фрыдрыха Фенса — намесніка гаўляйтэра Беларусі. У гэтым баі Кірыла Пракопавіч быў цяжка паранены. Без наркозу, у поўнай свядомасці перанёс ампутацыю звычайнай слясарнай нажоўкай адной рукі, аперацыю — другой. Здаровы ад прыроды арганізм, прага да жыцця, дапамога сяброў паднялі Кірылу Пракопавіча на ногі. Але слых страчаны амаль поўнасцю, цяжка без рук... І са сталіцы прыйшоў загад: «Выязджайце ў Маскву». Толькі пасля трэцяга напамінку сеў у самалёт. За паспяховае выкананне спецыяльнага задання Савецкага ўрада Арлоўскаму ў верасні 1943 года было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У Маскве ў Кірылы Пракопавіча была добрая кватэра, персанальная пенсія, іншыя даброты. Але ціхае, спакойнае існаванне не для яго. Хоць за плячыма было амаль пяць дзесяткаў, ён цвёрда вырашыў ажыццявіць свае юнацкія задумы па перабудове роднай вёскі. Пад дыктоўку бацькі дачка напісала ў Цэнтральны Камітэт ВКП(б): «Мае фізічныя недахопы — страта рук і слыху — не даюць магчымасці мне заставацца на ранейшай рабоце. Цяпер для мяне паўстала пытанне: ці ўсё я аддаў для Радзімы, для партыі? І я глыбока перакананы, што магу яшчэ прынесці карысць Савецкай краіне і ў мірнай працы». Кірыла Пракопавіч просіць накіраваць яго ў Мышкавічы для аднаўлення мясцовага калгаса, які ён яшчэ ў 1930 годзе, у час водпуску, дапамог арганізаваць.

Прыехаўшы ў ліпеньскія дні 1944 года ў родныя мясціны, Кірыла Пракопавіч убачыў дашчэнту спустошаную вёску. На кучы абгарэлых бярвенняў адбыўся першы сход калгаснікаў — жанчын, інвалідаў, дзяцей. Старшынёй землякі выбралі Арлоўскага, калгас назвалі «Рассвет». І зноў кінуўся ў бой, на гэты раз мірны, чалавек надзвычайнай волі і выключнай мужнасці.

Пад кіраўніцтвам Арлоўскага калгас «Рассвет» дабіўся выдатных поспехаў у развіцці грамадскай гаспадаркі. На пасадзе калгаснага важака Кірыла Пракопавіч быў, як і раней, настойлівы, смелы, ініцыятыўны. І за заслугі на мірнай ніве быў удастоены Залатой Зоркі Героя Сацыялістычнай Працы.

Ён аддаваў партыі, Радзіме, народу ўсяго сябе без астатку. Вёў вялікую партыйную, дзяржаўную і грамадскую работу — неаднаразова выбіраўся ў састаў ЦК КПСС, ЦК КП Беларусі, Магілёўскага абкома КП Беларусі, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, дэпутатам Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных. І да апошніх дзён сваіх заставаўся нязменна на пасадзе старшыні калгаса.

У адной з гутарак Арлоўскі сказаў: «Я ведаў многіх сяброў, якія былі і лепшымі, і храбрэйшымі за мяне, і больш здольнымі. Многія з іх загінулі. Яны маглі дабіцца значна большага, чым дабіўся я. Але такі ўжо лёс нашага пакалення: адны гінуць у баі, другія падхопліваюць іх сцяг і нясуць наперад. Нам, што засталіся жывымі, трэба быць дастойнымі іх памяці».

Цяжка да гэтага што-небудзь дадаць. Слаўнае жыццё Кірылы Пракопавіча Арлоўскага заўсёды будзе ўзорам служэння высокім ідэалам, натхняючым прыкладам.

У. БАБКОЎ,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КП Беларусі, кандыдат гістарычных навук.



Ветраны дзень. Фота А. ДУДКІНА.

АДРЕС, ИЗВЕСТНЫЙ ВСЕМ

Москва, Кропоткинская улица, 10. Здесь, в старинном особняке, помещается правление Советского фонда мира. Я пришла сюда, чтобы передать в фонд мира письмо и два фунта стерлингов от госпожи Л. Кланси из Великобритании. Они были посланы в редакцию газеты «Совет уикли» («Советский еженедельник»), издаваемой на материалах АПН Советским посольством в Лондоне. Госпожа Кланси, как явствует из ее письма, — пенсионерка, живущая в городе Саутхенд, является постоянной читательницей этой газеты.

Принимая деньги, ответственный секретарь правления фонда Леонид Никонов сказал:

— Правление Советского фонда мира с благодарностью принимает взнос госпожи Кланси. Нам тем более приятно выразить ей свою признательность, зная, что эти деньги госпожа Кланси передает из своей скромной пенсии. Вместе с другими средствами они будут направлены на оказание помощи народам развивающихся стран.

На днях правление фонда мира получило извещение из США о передаче в его адрес по завещанию довольно крупной суммы от господина Джона Зубона. Группа итальянских туристов, находившаяся в нашей стране, пришла на Кропоткинскую улицу и передала фонду мира значительную сумму в итальянских лирах. Необычная посылка прибыла и из Канады от известного писателя Дайсона Картера. В ней было 2 130 канадских серебряных монет достоинством в 25 центов каждая. В письме, сопровождающем посылку, Дайсон Картер писал:

«Эти монеты были собраны моей женой Шарлоттой еще при ее жизни с намерением передать их советским людям».

По подсчетам Советского фонда мира, в его деятельности участвуют 60 миллионов человек. Разные суммы переводят они в адрес фонда. Кто сколько может, столько и посылает. Кроме денежных переводов приходят ценные подарки—золотые и серебряные ювелирные изделия, ценные старинные предметы, произведения искусства, передаются наследства, недвижимость... Все это люди отдают в Советский фонд мира, чтобы помочь детям Вьетнама и Камбоджи, чтобы оснастить клинику в Гондурасе, построить школу в Египте или родильный дом в Ханое и, главное, для того, чтобы на земле не было войны.

Ольга ОБУХОВА.

ЦЕЛЬ СОТРУДНИЧЕСТВА— ЗАБОТА О ЧЕЛОВЕКЕ

ИНТЕГРАЦИОННЫЕ процессы, усиливающиеся под воздействием научно-технической революции, носят всеобщий характер. Но при этом надо отличать интеграцию как общий исторический процесс от ее конкретных проявлений в той или иной общественно-экономической системе. Ибо интеграция не безлика — в ней четко видны социальные, классовые контуры. Ее методы и цели определяются характером общественного строя.

Одна из основных целей социалистической экономической интеграции — все более полное удовлетворение растущих материальных и культурных потребностей населения на основе непрерывного развития и совершенствования общественного производства. Первостепенную роль в решении этой задачи призвана сыграть Комплексная программа социалистической интеграции, принятая в 1971 году.

Каждое мероприятие, предусмотренное Комплексной программой, — будь то соглашение о специализации и кооперировании производства или координации плановой деятельности, строительство совместными усилиями крупных производственных объектов или создание новых международных экономических организаций, все это в конечном счете призвано обеспечить, говоря словами Ленина, «законные потребности и прогрессивные стремления трудящихся масс» стран—членов СЭВ.

Вот конкретный пример. За годы народной власти в прежде отсталой, аграрной Болгарии при помощи СССР и других братских стран создана солидная машиностроительная база. Среди тех отраслей, которые получили большое развитие в стране, — производство средств внутризаводского транспорта. Растущий спрос на них на мировом социалистическом рынке позволяет машиностроителям НРБ увеличивать масштабы производства (за 1950—1972 гг. выпуск электротельферов в НРБ возрос более чем в 14 раз, электрокаров — в 10 раз), повышать серийность и снижать себестоимость изделий, совершенствовать их технический уровень. Это в свою очередь является одним из серьезных факторов роста производительности труда и улучшения экономических показателей работы предприятий, специализирующихся на выпуске такой техники. Поскольку формирование фондов материального стимулирования в условиях действующей ныне системы управления и планирования во многом связано с тем, как работает то или иное предприятие, уровень заработной платы и премий болгарских машиностроителей в большой степени представляет собой результат участия страны в международном социалистическом разделении труда. Но выгоды сотрудничества ощущаются не только в стране-производителе.

Болгарские погрузчики идут во многие страны—члены СЭВ. Только наша страна получила в 1971—1972 гг. 42 тысячи электротельферов и 61 тысячу электрокаров. Использование болгарских машин на советских предприятиях помогает механизации погрузочно-разгрузочных и складских работ и тем самым способствует решению такой важной проблемы, как сокращение объема ручного труда. За десять лет — с 1962 по 1972 год — парк электропогрузчиков у нас возрос в 4,2 раза, только за период с 1965 по 1971 год механизация погрузок и выгрузок товаров увеличилась на 50 процентов. Выгоды советско-болгарского сотрудничества в этой области очевидны.

Другой пример. Польские кораблестроители выпускают суда, многие из которых плавают под советским флагом. Траулеры, построенные на верфях Гданьска по последнему слову науки и техники, позволили значительно пополнить наш рыболовный флот. В Советском Союзе стабильно повышается потребление рыбы на душу населения (16,2 килограмма в 1973 г. против 12,6 в 1965 г.), и, конечно, немалая часть ее выловлена на судах, сделанных судостроителями Польши.

Еще один пример. Быстро растет в последние годы производство автомобилей на Волжском автомобильном заводе, который сейчас выпускает уже второй миллион машин. Прочные кооперационные связи с предприятиями Болгарии, Венгрии, Польши, Чехословакии и Югославии, поставляющими комплекты нескольких десятков узлов и деталей для «Жигулей», во многом способствуют обеспечению ритмичной работы завода на Волге. Пуск конвейеров ВАЗа на полную мощность сыграл решающую роль в увеличении «предложения» легковых автомобилей в Советском Союзе, продажа которых в личное пользование только за 1972—1973 гг. возросла почти в 2,4 раза.

Развитие специализации и кооперирования между странами—членами СЭВ после принятия Комплексной программы социалистической экономической интеграции приняло еще более широкие масштабы. Так, на январь 1974 года только Советский Союз заключил со своими коллегами по СЭВ 97 соглашений по специализации и кооперированию производства на многосторонней и двусторонней основе. На 1971—1975 гг. между СССР и другими странами—членами СЭВ было согласовано для совместной разработки около 1 900 проблем. Какой бы отрасли производства они ни касались, каких бы направлений научно-технического прогресса ни затрагивали, даже если в этих соглашениях не упоминается прямо об увеличении производства продуктов питания и товаров широкого потребления, тем не менее все они в конечном счете так или иначе будут способствовать повышению благосостояния народов стран социалистического содружества.

Народное хозяйство стран — членов СЭВ, как и мировая экономика в целом, предъявляет ныне быстрорастущий спрос на топливно-энергетические источники. За счет советских поставок страны — члены СЭВ удовлетворяют почти полностью свои импортные потребности в нефти, на 75 процентов — в нефтепродуктах, на 60 процентов — в каменном угле. Советская нефть не только улучшила топливно-энергетический баланс в этих странах, но и дала сильный толчок к развитию нефтехимии, а значение последней в производстве товаров народного потребления, как известно, весьма велико.

Интеграционные процессы все больше и больше захватывают сейчас как производство предметов потребления, так и их реализацию. Это касается сельского хозяйства, легкой и пищевой промышленности, розничного товарооборота.

Между странами—членами СЭВ идет, например, интенсивный обмен сортовыми семенами. Что дает такой обмен? Урожайность пшеницы в Венгрии в 1966—70 гг. была более чем на 30 процентов выше, чем в 1961—65 гг. В 1971—1973 гг. в среднем за год было собрано с гектара еще на 40 процентов больше, чем в предыдущие пять лет (из расчета на год). Немалая заслуга в этом принадлежит советским сортам пшеницы, которыми засеяно 80 процентов всех посевов этой культуры в ВНР.

Гарантированные поставки хлопка, шерсти, кожсырья из Советского Союза в страны — члены СЭВ стали важным фактором, определяющим общее развитие и структуру легкой промышленности этих государств, а также качество и ассортимент ее продукции.

Заботой о человеке и его здоровье, о нормальных условиях его работы и жизни проникнута вся идея сотрудничества социалистических стран в области охраны окружающей среды. XXVII сессия СЭВ, состоявшаяся в июне 1973 года, специально рассматривала комплекс вопросов, связанных с этой проблемой. В странах—членах СЭВ охрана и улучшение природопользования предусматривают обеспечение сохранности природно-климатических условий и сбалансированности экологической системы.

За четверть века существования СЭВ страны, входящие в него, убедительно продемонстрировали преимущества сотрудничества, основанного на социалистических принципах хозяйствования. Объем произведенного национального дохода стран СЭВ за 1949—1973 гг. возрос почти в 8 раз, тогда как в странах «Общего рынка» он увеличился в 3,3 раза. Промышленное производство в странах СЭВ развивалось в этот период темпами, почти втрое превышающими темпы, достигнутые в странах ЕЭС. В результате объем промышленного производства стран СЭВ возрос в общей сложности более чем в 12 раз, в то время как в странах «Общего рынка» —лишь в 4 раза.

Сейчас в странах—членах СЭВ производится примерно треть мировой промышленной продукции. В натуре это выглядит не менее убедительно — каждая третья тонна угля и минеральных удобрений, каждая четвертая тонна стали, цемента, одна пятая мирового производства электроэнергии, более 23 процентов выпуска хлопчатобумажных и 34 процента шерстяных тканей.

Такова в общих чертах та основа, на которой происходит решение важнейшей социально-политической задачи — дальнейший подъем материального благосостояния и культурного развития народов стран социалистического содружества.

Владимир АНТОШИН,
старший научный сотрудник
Института экономики
Академии наук СССР.

ЯНЫ АБАРАНЯЛІ НАША ДЗЯЦІНСТВА

(Заканчэнне.
Пачатак на 4—5-й стар.)

Менавіта з усяго гэтага і складалася тады яе жыццё. І ўсё ж Я. Чарняўская рашылася адшукаць падпольшчыкаў і пачала барацьбу з ворагам...

У яе пакоі шмат кніг. Імі застаўлены ўсе стэлажы. Талстой, Чэхаў, Кузьма Чорны, Якуб Колас... Побач, на журнальным століку, ляжыць раскрыты томік Купалы. Я асцярожна бяру яго, пачынаю гартаць. Ядвіга Антонаўна паварочваецца, пасля, усміхнуўшыся чамусьці свайму, далёкаму, павольна гаворыць:

— Каб вы толькі ведалі, як нам не хапала кніг там, у лесе. Ніколі не забуду той мінуты, калі ўпершыню пачула гэтыя набатныя словы Я. Купалы: «Партызаны, партызаны, беларускія сыны...» Многія з нас тады плакалі...

І Ядвіга Антонаўна стала расказваць, як разам з сяброўкай, таксама настаўніцай, Верай Івановай дабіраліся яны да партызан. Атрады партызанскай брыгады імя Свярдлова знаходзіліся ў тыя дні ў Іванаўскім раёне. Ёсць там вядомыя Спораўскія балоты.

Калі ў канцы 1942 года батальёны карнікаў пачалі паліць сёлы, сяляне, прыхапіўшы з сабою ўсё, што толькі можна было ўзяць, ішлі цэлымі сем'ямі пад ахову партызан.

Летам яшчэ было цярпіма. Зімой жа, як толькі лёд скоўваў дрыгву, гітлераўцы блакіравалі балота танкамі і ў які ўжо раз спрабавалі прарваць абарону народных мсціўцаў. Гэта былі асабліва цяжкія дні. Галадалі, мерзлі. Кастроў паліць нельга. Фашысцкія лётчыкі скідвалі бомбы, абстрэльвалі з кулямётаў кожную пядзю зямлі.

І вось у такіх умовах па рашэнню падпольнага абкома партыі ў сямейных лагерах сталі ствараццa школы. У хуткім часе байцам партызанскага атрада імя Макарэвіча Ядвізе Чарняўскай і Веры Івановай даручаюць новае баявое заданне: арганізаваць школу.

У паўкіламетры ад сямейнага лагера, на астраўку сярод балот, знайшлі палянку, якую зверху надзейна прыкрывалі густыя галіны дуба. Партызаны расчысцілі пляцоўку, убілі ў зямлю некалькі доўгіх жэрдак, абплялі іх прутамі вярбы, уцяплілі мохам. Дах накрылі фанерай і старанна замаскіравалі лапкамі елкі. З плашак бярозы былі зроблены парты, стол для настаўніка. А самы вялікі ліст фанеры ўмацавалі на ствале дуба. Відаць таму, калі партызаны вялі размову аб школе, звычайна называлі яе проста «ля дуба». А размова пра яе заходзіла часта: байцы атрада памяталі свае бацькоўскія абавязкі. Разведчыкі, вярнуўшыся з задання, прыносілі ў школу алоўкі, лісткі паперы, а то раптам і цэлы рулон невядома дзе здабытых шпалераў. А аднойчы нехта з падрыўнікоў уручыў дзецям нават... сапраўдны школьны званок.

— Вось так і вучыліся!— Ядвіга Антонаўна зноў доўга моўчкі глядзіць на агні вячэрняга горада. Пасля нечакана пытае:

— Ведаеце, што страшней, бадай, за самалёты, больш балюча за асколкі было тады для нас, жанчын?... Вам гэта цяжка ўявіць, але я ўжо ніколі не змагу забыць гэтыя вочы дзяцей. Шырока раскрытыя вочы, у якіх нічога няма, акрамя страху!.. І партызаны рабілі ўсё, каб зберагчы дзяцей, накарміць, дастаць цяплейшую вопратку. Потым, як бачыце, былі створаны і школы. К вясне сорак чацвёртага толькі ў нас, на Брэстчыне, працавала дзевятнаццаць партызанскіх школ.

І Ядвіга Антонаўна стала з захапленнем расказваць аб настаўніках суседніх школ. Я запісваў іх прозвішчы і думаў: колькі добрых, мужных людзей рабілі ўсё, каб зберагчы наша дзяцінства! І не толькі наша.

Сёлета маю дачку прынялі ў піянеры. Для яе Айчынная вайна — гэта ўжо далёкая гісторыя. Але я вельмі хачу, каб і ў яе біяграфію незаўважным радком, незабыўнай памяццю ўвайшоў подзвіг тых, хто абараняў маё дзяцінства.

Мікалай САКАЛОЎ.



Пры Палацы культуры Гомельскага хімічнага завода створан новы самадзейны калектыў — хор хлопчыкаў. Кіраўнік Людміла Чудак развучвае з юнымі спевакамі нумары першай канцэртнай праграмы. НА ЗДЫМКУ: хор хлопчыкаў.

Фота Ч. МЕЗІНА і М. ВЫСОЦКАГА.

ЛАЎРЭАТЫ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР 1974 ГОДА

НА ПАЗІЦЫЯХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГУМАНІЗМУ

Чытачы «Голасу Радзімы» ўжо ведаюць, што сям'я лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі БССР папоўнілася новымі імёнамі пісьменнікаў, драматургаў, кампазітараў, майстроў кіно, скульптараў і журналістаў. Высокіх званняў удастоены аўтары твораў, якія атрымалі шырокае прызнанне чытачоў і гледачоў, сталі з'явай у беларускай савецкай культуры.

Аб работах, адзначаных Дзяржаўнымі прэміямі 1974 года, мы раскажам на старонках газеты. Гэтыя публікацыі пачынаюцца артыкулам кандыдата філалагічных навук Сцяпана ЛАЎШУКА, прысвечаным камедыі Кандрата Крапівы «Брама неўміручасці», за якую народнаму пісьменніку Беларусі прысуджана прэмія імя Янкі Купалы.

П'есы лепшых беларускіх пісьменнікаў, а Кандрата Крапівы ў першую чаргу, заўсёды вызначаліся вялікай праблематычнасцю. На сучасным этапе развіцця беларускай драматургіі, як, магчыма, ніколі раней, гэтая праблематычнасць і сацыяльная напоўненасць сталі асабліва прыкметнымі. Драматургі асэнсоўваюць не толькі бытавы бок рэчаіснасці, але і сферу інтэлектуальную, маральна-этычную. Беларуская драматургія падышла бліжэй за іншыя жанры літаратуры да раскрыцця важных праблем чалавечага агульнажыцця. Камедыёграфы добра адчулі пульс сучаснасці, эпохі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. Новыя адкрыцці дыктуюць змены не толькі ў сферы сродкаў вытворчасці, але непасрэдна ўплываюць на многія іншыя аспекты грамадскага жыцця.

На пытанне, што можа прынесці навука грамадству, спрабуе адказаць і Кандрат Крапіва ў п'есе «Брама неўміручасці». Нагадаем, што перад намі не проста камедыя, а камедыя фантастычная. Праўда, фантастычнае ў творы толькі адно: адкрыццё вучоным-герантолагам сакрэту неўміручасці, а ў астатнім — поўная рэальнасць. Драматург прапануе вясёлы і ў той жа час вельмі сур'ёзны роздум аб чалавечнасці і неўміручасці...

Гіпатэтычная карціна чалавецтва, якое нарэшце дачакалася светлай явы вечнага жыцця, атрымалася пераканаўчай. Гэта адбылося таму, што ў драматургу адначасова ўвасобіліся вучоны, сацыёлаг, мастак. І верыш кожнаму з іх: дакладныя навуковыя выкладкі настолькі арганічна ўплятаюцца ў мастацкі лад п'есы, што ствараецца ўражанне цэласнасці, губляецца адчуванне кампанентаў, чытач і глядач не звяртае ўвагі на пэўную рацыяналістычнасць, эмпірызм камедыі, а пільна сочыць за развіццём аўтарскай думкі.

Над п'есай «Брама неўміручасці» Кандрат Крапіва працаваў даволі працяглы час. Гэта адзін з наватарскіх твораў пісьменніка. Фармальна драматург не выведзены ў п'есе, аднак прысутнасць яго адчуваецца за кожнай фразай, за кожнай рэплікай, за выяўленнем сімпатый і антыпатый.

Чалавек... Колькі ў ім яшчэ супярэчлівага, незразумелага і нават непазнанага! Не дарэмна ж кажуць, што каб добра ўведаць чалавека, патрэбна з ім пуд солі з'есці. У мастацтва свае законы пазнання. Так і Кандрат Крапіва ўжывае вельмі дасціпны прыём: вывярае сутнасць чалавека святлом неўміручасці. І гэта святло дазволіла добра разгледзець не толькі станоўчае, але і ўсё цёмнае, аджыўшае, што да часу хавалася ў таемных закутках нашага жыцця. Характэрна, што тыя, каму неўміручасць не павінна і сніцца, дабіваюцца яе з найбольшым імпэтам. Перад намі праходзіць цэлая галерэя персанажаў: Караўкін, Дажывалаў, Застрамілава, Торгала...

З пазіцыі сацыялістычнага гуманізму драматург гнеўна бічуе ваяўнічае мяшчанства, усё тое, што перашкаджае гарманічнаму развіццю нашага грамадства. У сваёй новай п'есе Кандрат Крапіва працягвае сатырычную лінію «Мілага чалавека». Прыгледзеўшыся, можна ў асобе Караўкіна пазнаць многія рысы герояў папярэдніх п'ес пісьменніка і, у прыватнасці, Чарскага-Жлукты. Прынамсі, прыёмы і метады арганізацыі афёр засталіся ранейшымі. Караўкін «дастойна» прадстаўляе катэгорыю людзей, якія дзейнічаюць па прынцыпе: ты — мне, я — табе.

Караўкіным у камедыі процістаяць сумленныя працаўнікі на ніве народнай гаспадаркі, народная інтэлігенцыя. Драматург сцвярджае, што права на неўміручасць мае толькі той, хто ўсе свае сілы аддаў на карысць грамадства. Так, як Дабрыш, як Кудрыцкая, як Сідаровіч...

Цікава вырашаны канфлікт камедыі. Ён развіваецца не паміж адмоўнымі і станоўчымі персанажамі, а як процідзеянне новаму адкрыццю, супроць якога выступілі і адмоўныя, і станоўчыя персанажы. Станоўчыя пярэчылі супраць яго з грамадзянскіх пазіцый: адкрыццё ўваскрашала няроўнасць і несправядлівасць. А Караўкін і да яго падобныя пратэстуюць па вядомай прычыне: раз не ім, то лепш нікому. Апрача маральнага, існуе яшчэ і эканамічны аспект праблем. Дзякуючы неўміручасці адбудзецца нябачаны прырост насельніцтва, і эканоміка будзе няздатнай забяспечыць пражытачны мінімум. Выяўляецца шматзначны парадокс: не ўсякі навуковы прагрэс спрыяе чалавеку. Так што думай, вучоны, перш чым абнародаваць свае адкрыцці, узважвай, якія практычныя вынікі атрымаюцца з гэтага...

Драматург даказвае, што неўміручасць у прамым сэнсе наўрад ці спатрэбіцца чалавецтву. Жыццё толькі таму і набывае такую каштоўнасць, што існуе смерць. Вывад драматурга нечаканы: смерць не самае страшнае для жыцця. Такое вырашэнне праблемы жыцця і смерці магчыма толькі ў творчасці пісьменніка-гуманіста, узброенага марксісцка - ленінскім разуменнем сутнасці грамадскага развіцця, пазбаўленага індывідуалістычных, эгацэнтрычных прэтэнзій. Вытокі вываду пісьменніка — у народнай мудрасці. Неўміручасць не ў тым, каб захаваць сваё біялагічнае існаванне, а ў тым, каб застацца ва ўдзячнай памяці нашчадкаў.

П'еса «Брама неўміручасці», вырашаючы надзвычай важныя філасофскія і эстэтычныя праблемы, вызначаецца яшчэ і сваёй багатай камедыйнай фактурай. Кандрат Крапіва — выдатны знаўца беларускай народнай лексікі, і гэта дапамагло яму дабіцца вельмі дакладнай моўнай характарыстыкі персанажаў. Твор багата насычаны здаровым народным гумарам і напісаны з добрым веданнем патрабаванняў сцэны. Менавіта гэта і забяспечыла яму поспех у аматараў тэатра.

Сцяпан ЛАЎШУК,
кандыдат філалагічных навук.

З АПОШНІХ ВЕРНІСАЖАЎ

Подзвіг герояў, загінуўшых у Вялікай Айчыннай, — у сэрцах жывых. Да гэтай тэмы не раз звярталіся беларускія жывапісцы, скульптары, графікі. Шырока яна была прадстаўлена на выстаўцы беларускіх мастакоў у сталічным Палацы мастацтваў. Каля 180 майстроў паказалі на ёй больш за 350 работ, створаных у апошнія два гады.

Гэты вернісаж быў своеасаблівы: без удзелу журы кожны аўтар сам вырашаў, што ён лічыць неабходным паказаць гледачу. Выстаўка дала магчымасць выступіць вялікай колькасці мастакоў, якія не заўсёды трапляюць на тэматычныя агляды, выявіла многія цікавыя напрамкі мастацкіх пошукаў.

НА ЗДЫМКАХ: В. САМАЧОРНАЎ. «Бежанцы»; Ю. ТЫШКЕВІЧ. «Дом Купалы».

СЕЙБІТ РАЗУМНАГА, ДОБРАГА, ВЕЧНАГА

Свой паўвекавы юбілей адзначыў рэспубліканскі часопіс «Народная асвета» — настаўнік і сябра вялікай арміі беларускіх педагогаў.

«Народная асвета» — адзін з важнейшых каналаў укаранення дасягненняў педагагічнай навукі ў практыку камуністычнага выхавання, у работу савецкай школы. Яго асноўная лінія — метадычная дапамога настаўніку. Аб гэтым сведчаць і назвы часопіса. У 1937—1940 гадах, напрыклад, ён называўся «Кансультацыя настаўніку», з 1945—«У дапамогу настаўніку», пасля 1948 года — «Савецкая школа». Назву «Народная асвета» ён атрымаў у 1960 годзе. Але якія б словы ні стаялі на вокладцы часопіса, усе 50 год ён быў сейбітам разумнага, добрага, вечнага, верна служыў высакароднай справе камуністычнага выхавання маладога чалавека, узбройваў педагогаў тэорыяй і перадавым вопытам.

На старонках часопіса многа карыснага знаходзяць для сябе выкладчыкі беларускай мовы і літаратуры, гісторыі і геаграфіі БССР — прадметаў, па якіх нідзе, акрамя «Народнай асветы», яны не знойдуць метадычных парад. Шмат увагі часопіс удзяляе пачатковай школе. На яго старонках асвятляецца вопыт лепшых настаўнікаў, ставяцца праблемы сучаснай педагогікі. Пачэснае месца ў часопісе займаюць пытанні выхавання — патрыятычнага, маральнага, працоўнага, прававога, эстэтычнага.

З выпадку 50-годдзя часопіса ў Мінску адбыўся ўрачысты сход, прысвечаны знамянальнай даце і ўзнагароджанню «Народнай асветы» ордэнам «Знак Пашаны». У святочна ўпрыгожаны будынак Тэатра юнага гледача прыйшлі работнікі асветы, настаўнікі, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў, выхавацелі дзіцячых садоў, дзеячы навукі і культуры, прадстаўнікі партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый.

На сходзе выступіў старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР Ф. Сурганаў, які падкрэсліў, што разам з рэдакцыяй і аўтарскім калектывам «Народнай асветы», разам з педагогамі Беларусі юбілей часопіса адзначаюць усе працоўныя, уся грамадскасць рэспублікі, бо справа народнай асветы ў нашай краіне з'яўляецца агульнапартыйнай, агульнадзяржаўнай справай.

Ф. Сурганаў зачытаў тэкст прывітання Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі калектыву рэдакцыі і аўтарскаму актыву ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем часопіса і ўзнагароджаннем яго ордэнам «Знак Пашаны», у якім выказваецца ўпэўненасць у тым, што «Народная асвета», «прытрымліваючыся слаўных ленінскіх традыцый друку, будзе і надалей паляпшаць работу па расшырэнню навуковага светапогляду і павышэнню метадычнага майстэрства работнікаў народнай асветы, удасканальванню навучальнага працэсу ў школах, развіццю педагагічнай навукі і прапаганды яе дасягненняў».

Пра 50-гадовы шлях часопіса расказала на сходзе галоўны рэдактар «Народнай асветы» В. Маскаленка.

— З самага пачатку, — сказала яна ў прыватнасці, — часопіс цікавіла тэма набліжэння навучання да жыцця. У 1925 годзе на яго старонках упершыню ўзнімаецца пытанне аб рабоце дзяцей на зямельных участках пры школах. «Практыка сельскагаспадарчага ўхілу пры выкладанні прыродазнаўства ў Койданаўскай сямігодцы» — так у чацвёртым нумары часопіса называўся артыкул настаўніка Р. Гацко, аднаго з першых аўтараў, які і сёння плённа супрацоўнічае з «Народнай асветай». На гэтыя тэмы пісаў у часопіс і настаўнік В. Купрэвіч, пазней вядомы беларускі батанік і фізіёлаг, прэзідэнт АН БССР.

Пытанні працоўнай арыентацыі не сыходзяць са старонак часопіса на працягу яго выдання. Цяпер, у перыяд навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, ім надаецца асаблівая ўвага.

У 30-ыя гады, адзначыла В. Маскаленка, часопіс вёў барацьбу з непісьменнасцю, адсталасцю, нёс святло культуры ў самыя аддаленыя куткі рэспублікі. Змяніўся час, змяніліся маштабы народнай адукацыі. Калі «Асвета» (так называўся часопіс у першыя гады існавання) змагалася за ўсеагульнае пачатковае навучанне, то «Народная асвета» спрыяе поўнаму завяршэнню дзесяцігадовага ўсенавучання. У 1925 годзе часопіс з гордасцю канстатаваў, што школы рэспублікі наведваюць 339 тысяч дзяцей і ў іх працуюць 7 700 настаўнікаў. Сёння звыш 100 тысяч настаўнікаў вучаць больш за 1,6 мільёна беларускіх школьнікаў.

Высокую ацэнку дзейнасці «Народнай асветы» далі ўсе, хто вітаў часопіс у дзень яго слаўнага юбілею. Далейшага творчага росту і багатых набыткаў пажадаў часопісу міністр асветы БССР М. Мінковіч; са словамі прывітання выступіў лаўрэат Ленінскай прэміі народны пісьменнік БССР І. Мележ; ад імя беларускіх настаўнікаў шчырую ўдзячнасць за дапамогу ў паўсядзённай рабоце выказала заслужаная настаўніца БССР Ф. Камарова. З усіх куткоў рэспублікі ў адрас юбіляра прыйшлі шматлікія віншаванні ад чытачоў часопіса, ад тых, хто выконвае самую адказную справу ў грамадстве — выхоўвае і вучыць дзяцей.

Н. МІЛАСЛАЎСКАЯ.

Ленінскі праспект сталіцы Савецкай Беларусі ўпрыгожыла яшчэ адно унікальнае збудаванне. Па праекту архітэктара Валянціна Малышава і інжынера Наталлі Мароз мінскія будаўнікі ўзвялі насупраць галоўнага корпуса Акадэміі навук БССР самы вялікі ў нашай рэспубліцы кінатэатр «Кастрычнік». На яго затрачана больш як два мільёны рублёў.

Узводзіць і аснашчаць гэты цудоўны палац дапамагалі масквічы і ленінградцы, якія прысылалі ў Мінск сучаснае абсталяванне і абліцовачныя матэрыялы.

Глядзельная зала разлічана на 1400 месц. Яны размешчаны падковай перад экранам памерам 16×24 метры. Гэта зроблена для таго, каб усе гледачы знаходзіліся ў роўных умовах, на аднолькавай адлегласці ад экрана.

Дарэчы, кінатэатр разлічаны не толькі на дэманстрацыю фільмаў. Тут будуць праводзіцца канцэрты, лекцыі, выступленні. Тэхнічнае аснашчэнне таксама незвычайнае. Акрамя самых сучасных кінаапаратаў, у зале ўстаноўлена кабіна для сінхроннага перакладу, гукавая апаратура тэатральнага тыпу, а кандыцыянеры заўсёды будуць падтрымліваць чыстае паветра. Да паслуг наведвальнікаў кафэ і займальная эстрадная праграма.

Адкрыццё новага кінатэатра ў Мінску супала з прэм'ерай каляровага шырокафарматнага фільма «Блакада», створанага на студыі «Ленфільм». Кінаэпапея расказвае пра мужнасць і гераізм абаронцаў Ленінграда.

ЛЮБЫЯ СЭРЦУ МЯСЦІНЫ

ПА КОЛАСАЎСКІХ СЦЕЖКАХ

БЫВАЕ так: усё некуды імкнешся, недзе спяшаешся пабываць, паездзіць, паглядзець, і заманлівасць гэтых паездак здаецца тым большай, чым далей ад дому мяркуеш паехаць. А ўжо калі за мяжу... А потым неяк раптам спахапляешся, што як след не ведаеш нават свой родны край, і не якую-небудзь там далёкую тэрыторыю, а блізкія мясціны. І каб сказаць, што глядзець тут нечага. Едуць жа сюды натоўпамі турысты. І ў той час, калі ты марыў пра заморскую паездку, яны таксама думалі з заміраннем сэрца: вось, маўляў, і збылася мая даўняя мара, еду на гэтую далёкую Стаўбцоўшчыну, пахаджу па тых сцежках, дзе хадзіў Якуб Колас.

Нельга сказаць, што я зусім не ведаў родных мясцін паэта. Бываў і ў Акінчыцах, і ў Дубах, і ў Смольні, і ў Мікалаеўшчыне, але ўсё выпадкова, а вось каб праехаць спецыяльна — неяк не выпадала. Ну, хаця б па тых месцах, што згадваюцца ў паэме «Новая зямля».

...Пад колы матацыкла мякка кладзецца шырокая лясная дарога. Толькі што засталіся ззаду апошнія будынкі Стоўбцаў, а наперадзе, сярод соснаў, зноў віднеецца жыллё. Лес разбягаецца ў бакі, але не настолькі, каб даць нейкі шырокі прастор — поле ці луг. Сосны і яліны ўздымаюцца проста сярод двароў, падступаюць да агародаў, сапернічаюць з тэлевізійнымі антэнамі. Расце і шырыцца колішні невялікі засценак Акінчыцы.

У цэнтры паселішча на пярэдні план сціпла, хаця і са зразумелай годнасцю, выходзіць просценькая хатка ўжо нязвыклай для нас архітэктуры. Вузенькая не то галерэя, не то ганак. На круглыя слупы абапіраецца застрэшак. Невялікае вакенца расчэрчана надта ж густой сеткай пераплёту. Дрэва старое, усё ў трэшчынах...

Добра памятаю сонечны вераснёўскі ранак 1961 года. Уся прастора перад хаткай забіта святочным натоўпам. Грае музыка, гаворацца прамовы, выступаюць пісьменнікі, пабачыць якіх сваімі вачыма дагэтуль я толькі марыў. А на шэрай сцяне хаткі, нібы медаль на грудзях маці-гераіні, засвяцілася мармуровая дошка. «Тут 3 лістапада 1882 года нарадзіўся народны паэт Беларусі Якуб Колас — Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч». Урачыстасці былі ў той дзень і ў іншых месцах, але больш за ўсё помняцца іменна Акінчыцы. Пэўна, з-за незвычайнай, да шчымлівага болю, любасці да ласкавага восеньскага сонца, да блізкага лесу, да гэтай хаткі і з-за адпаведнасці такога настрою ўсім урачыстасцям...

Мой родны кут, як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы.

Вядомыя ўсім радкі, што сталі сімвалам роднага краю, напісаны пра Альбуць, ці ў паэме — Парэчча. Здаецца, яны маглі б нарадзіцца ў душы кожнага, хто тут жыў. Прырода нібы спецыяльна сабрала ў адным месцы ўсё характэрнае для нашага краю. Векавы лес, луг, Нёман побач, у зараснікаx алешніку — «травой заросшая крынічка». Да таго ж усё гэта фарбавалася ў ружовы колер дзяцінства — той пары, калі ўсякія беды і нягоды жыцця цябе яшчэ не вельмі засмучаюць. Што з таго, што ў школу ў Мікалаеўшчыну хадзіць далёка, што бацька, ляснік Міхал, рэдка бывае вясёлым, што абуць нечага. Затое як цікава слухаць расказы людзей, якія збочваюць з дарогі, каб зайсці пагрэцца. А настане вясна — і гэта цудоўнае наваколле абяцае столькі забаў...

Сярод прынёманскага лугу— ярка-зялёны астравок, што на пабурэўшай лугавіне выглядае быццам аазіс. У засені магутных ліп — несамавітая хацінка, хлеў, агародчык. У плот уткнуліся насамі аўтобусы, машыны, матацыклы. На двары таўкуцца экскурсанты, заглядваюць ва ўсе шчыліны, снуюць ад хаты да белакаменнага двухпавярховага будынка музея. Гучаць руская, беларуская, англійская мовы...

Кірую туды, дзе большы натоўп. Так і ёсць, у цэнтры — добраахвотны экскурсавод па Смольні Іосіф Міхайлавіч, «Юзік-шаляніца». Ён расказвае невялікі ўрывак з паэмы «Новая зямля» (хаця, дарэчы, ведае яе ўсю на памяць), потым успамінае пра сустрэчу брата з Янкам Купалам на гэтым хутары ў 1912 годзе, пра асаблівую любоў Якуба Коласа да гэтых мясцін. Будучы ўжо вядомым паэтам, Канстанцін Міхайлавіч часта наязджаў сюды. Гэтыя ліпы ён пасадзіў калісьці сам, і глядзі ты, якія вымахалі. Жывы помнік паэту.

Мікалаеўшчына — даволі вялікае, на некалькі вуліц, сяло. На галоўнай вуліцы — горы пяску, па дне траншэі цягнецца доўгая нітка труб. Дом культуры... Бюст паэту... Белакаменны двухпавярховы будынак школы імя Я. Коласа... Самі сабой усплываюць у памяці радкі з яго верша «Наша сяло»:

Спарахнела наша школа—
Згніў паркан увесь наўкола—
Школка горбіцца, як склюд.

Гэтыя радкі — усё, што засталося ад старой школы.

Можна было б затрымацца ў Мікалаеўшчыне больш, пахадзіць па ваколіцах, пагутарыць з людзьмі, якія памятаюць паэта, зайсці ў школу, дзе ўжо многа год існуе літаб'яднанне «Маладыя каласкі». Але сонца хіліцца да захаду і час вяртацца.

Галоўная вуліца спускаецца да Нёмана і ўзбягае на драўляны мост. Уз'язджаю на стары гасцінец, што вядзе ў бок Новага Свержаня і далей на Стоўбцы. Вочы цешыць прастор. Такіх суцэльных лясоў, што суправаджалі мяне ад Стоўбцаў да Мікалаеўшчыны па той бок Нёмана, тут няма, толькі дзе-нідзе па ўзгорках зелянеюць маладыя бярэзнікі альбо збягаюць да прырэчнага лугу альховыя зараснікі. Паабапал гасцінца, нібы пацеркі на нітцы,— вёскі са старажытнымі назвамі: Кнотаўшчына, Белькаўшчына, Шахноўшчына... Маляўнічыя краявіды, ласкавая цеплыня летняга вечара выклікаюць нейкую асаблівую замілаванасць і заспакоенасць, жыццёвыя непрыемнасці і хваляванні здаюцца надуманымі і нерэальнымі, а сам ты — нібы часцінка гэтага пейзажу, гэтай зямлі, якая цябе ўзгадавала. Хочацца як найдаўжэй расцягнуць асалоду, і рука міжволі збаўляе газ...

«Кропка» ў маім падарожжы — высокі ўзгорак ля Новага Свержаня. Наваколле адсюль відаць на многа кіламетраў. Унізе— старажытнае мястэчка, той самы Свержань, адкуль любімы дзядзька Антось прыносіў Кастусю «пляцку». У цэнтры мястэчка — густая зеляніна, з якой тырчаць у неба гмахі старажытнай царквы і касцёла. Шырокія лугі разрэзаны бліскучай стужкай Нёмана, а за ім— густы сіні колер лесу. Можна зразумець паэта, які часта любаваўся з гэтай гары наваколлем. Тут і сам гатоў не то спяваць, не то плакаць, не то смяяцца ад шчасця.

Мой родны кут!..

Яўген САХУТА.

Спорт

НА ПРЫЗ ЗІМОВЫХ КАНІКУЛ

У Мінску закончылася спрэчка мацнейшых лёгкаатлетаў вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі на прыз «Зімовых канікул». За яго змагаліся на адкрытых і закрытых стадыёнах сталіцы БССР звыш 250 студэнтаў, якія спаборнічалі ў бегу, спартыўнай хадзьбе, кіданнях, скачках, лёгкаатлетычным шматборстве.

Лепшым дасягненнем спаборніцтваў быў вынік студэнта БПІ Валерыя Байко. У скачках з шастом ён пераадолеў планку на вышыні 5 метраў 35 сантыметраў, выканаў нарматыў майстра спорту СССР міжнароднага класа і ўстанавіў новы рэспубліканскі рэкорд.

ТРЫУМФ САВЕЦКІХ ФІГУРЫСТАЎ

Тры вышэйшыя ўзнагароды заваявалі ў чатырох відах праграмы савецкія майстры фігурнага катання на каньках на чэмпіянаце Еўропы, які завяршыўся ў Капенгагене. Такога не ўдавалася дабіцца спартсменам ніякай іншай краіны за ўсю гісторыю гэтых спаборніцтваў. Упершыню з 1956 года, калі савецкія фігурысты дэбютавалі на першынстве кантынента, залаты медаль у адзіночным катанні дастаўся масквічу Уладзіміру Кавалёву. Сярод жанчын, завяршыўшых турнір, перамогу ў трэці раз заваявала Крысціна Эрат з ГДР.

У іншых відах праграмы па традыцыі дамінравалі масквічы: муж і жонка Людміла Пахомава і Аляксандр Гаршкоў, якія ў пяты раз заваявалі тытул першай танцавальнай пары, а таксама Ірына Радніна і Аляксандр Зайцаў.



У чэмпіянаце краіны па баскетболу ўдзельнічае каманда спартсменаў з Беларускага радыётэхнічнага інстытута. Восем гульняў турніра былі праведзены ў Мінску. Баскетбалісты РТІ сустракаліся з вільнюскай «Стацібай», тбіліскім «Дынама», свярдлоўскім «Уралмашам»... Мінскія балельшчыкі мелі магчымасць убачыць усе мацнейшыя баскетбольныя клубы краіны, сталі сведкамі захапляючых паядынкаў.

Чэмпіянат працягваецца.

НА ЗДЫМКУ: момант гульні баскетбалістаў РТІ з узбекскай камандай.

Фота М. ХАДАСЕВІЧА.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-02-80, 33-03-15, 33-01-97, 33-15-15.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 242.